iSANS | The International Strategic Action Network for Security

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ У БЕЛАРУСІ

**Агляд асноўных падзей і тэндэнцый за сакавік 2025 года**

**Гэтае даследаванне ўяўляе сабой агляд асноўных падзей, якія адбываліся ў Беларусі ў сферы культуры і гістарыяграфіі цягам сакавіка 2025 года і маюць дачыненне да фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці.**

У сакавіку былі выяўлены такія тэндэнцыі:

- **Міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы культуры афіцыйных беларускіх уладаў па-ранейшаму застаецца амаль цалкам манапалізаваным Расіяй.**

  У сакавіку 2025 года ў Telegram-канале Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь былі змешчаны 40 арыгінальных навін (у папярэдніх двух месяцах — 13 і 26), якія тычацца міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры.

| **Краіна** | **колькасць навін** |
|---|---|
| Расія | 26 (у папярэдніх двух месяцах — 8 і 20) |
| Азербайджан | 5 |
| Узбекістан | 2 |
| Кітай | 2 |
| Індыя | 1 |
| Турцыя | 1 |
| Бурундзі | 1 |
| Арменія | 1 |
| Швейцарыя | 1 |

Галоўным для Беларусі партнёрам у культурнай сферы па-ранейшаму застаецца Расійская Федэрацыя. У сакавіку прайшлі супольныя беларуска-расійскія мерапрыемствы, сустрэчы: Міністр культуры Беларусі Руслан Чарнецкі правёў рабочую сустрэчу з губернатарам Прыморскага краю Алегам Кажамякам[1], у рамках візіту дэлегацыі Рэспублікі Беларусь ва Уладзімірскую вобласць Расійскай Федэрацыі адбыліся перагаворы з Міністрам культуры Уладзімірскай вобласці[2], у Екацярынбургу прайшлі «Дні Мінска»[3], у Маскве адбылася прэзентацыя праекта Вялікага тэатра Беларусі «Патэтычны дзённік памяці»[4], працягнуўся сумесны праект Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага Рускага музея «Расія — Беларусь. Скрыжаванне лёсаў»[5] і ншыя.

Таксама можна гаварыць пра намаганні беларускіх уладаў наладзіць стасункі (ў тым ліку культурніцкія) з усходнімі і паўднёвымі краінамі. Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Руслан Чарнецкі правёў сустрэчу з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь Рахматулам Назаравым[6], з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Турэцкай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Гючлю Джэмам

---

[1] https://t.me/minkultrb/50062
[2] https://t.me/minkultrb/50335
[3] https://t.me/minkultrb/50616
[4] https://t.me/minkultrb/49879
[5] https://t.me/minkultrb/50597
[6] https://t.me/minkultrb/50288

Ышыкам[7,8]; Пасол Беларусі ва Узбекістане Аляксандр Агароднікаў правёў сустрэчу з Міністрам культуры Рэспублікі Узбекістан Азодбекам Назарбекавым[9]; была падпісана дамова аб двухбаковым супрацоўніцтве паміж Беларускай дзяржаўнай акадэміяй музыкі і Хайнаньскім педагагічным універсітэтам (КНР), якая прадугледжвае супольныя адукацыйныя, творчыя і навуковыя праекты ў сферы музычнага мастацтва[10] і іншыя.

Што тычыцца супрацоўніцтва з заходнімі краінамі, то цягам месяца быў зафіксаваны толькі адзін выпадак: у Міністэрстве культуры адбылася сустрэча з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Швейцарскай Канфедэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Крысцінай Хонегер-Залатухін[11].

- **Расія, (пра)расійскія арганізацыі і актывісты не спыняюць сваю актыўнасць, праводзячы ў Беларусі экспансію расійскай культуры і рускай мовы і ствараючы падмурак для далейшай інтэграцыі праз мерапрыемствы, конкурсы, распаўсюджванне кніг і г. д.**

У перыяд з 1 па 31 сакавіка 2025 года расійскія арганізацыі былі ініцыятарамі ці (і) ўдзельнікамі такіх мерапрыемстваў і праектаў у Беларусі:

**- навязванне рускай мовы і літаратуры:** сустрэча размоўнага клуба «Рускі як замежны»[12], сустрэча з членам Саюза пісьменнікаў Расіі Леанідам Сідаравым[13], перадача ў фонды школьных бібліятэк вучэбнай і мастацкай літаратуры расійскіх аўтараў[14], літаратурны турнір для школьнікаў на веданне рускіх пісьменнікаў[15], музычна-паэтычны канцэрт «Вялікае рускае слова»[16], літаратурная сустрэча «Мама для Маманцяня»[17], фінал нацыянальнага беларускага этапу Міжнароднага конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка»[18], конкурс чытальнікаў «Гучныя чытанні "Вася Цёркін — наш герой!"»[19], інтэлектуальная гульня па творчасці Івана Крылова[20], літаратурная гасцёўня, прысвечаная творчасці А. П. Чэхава[21], сустрэча з аўтарамі літаратурна-мастацкага часопіса «Метамарфозы»[22].

**- папулярызацыя савецкай эпохі і праслаўленне ВАВ:** гістарычная лекцыя «У небе начныя ведзьмы»[23], адкрытая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Карбышаўскія чытанні. Пошук, навука, практыка, якасць»[24], тэлемост Гродна — Калінінград «Жаночы твар Перамогі»[25], лекторый, прымеркаваны да 80-й гадавіны Вялікай Перамогі[26], сустрэча ў рамках праекта «Урокі жывой гісторыі»[27], інтэрактыўная гульня «100 вялікіх дасягненняў: ці ведаеце Вы іх?»[28], акцыя «Георгіеўская стужка»[29].

---

7 https://t.me/minkultrb/49894
8 https://t.me/minkultrb/49896
9 https://t.me/minkultrb/49921
10 https://t.me/minkultrb/49990
11 https://t.me/minkultrb/50553
12 https://t.me/russiangomel/6479
13 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16586
14 https://t.me/rcnkbrest/26123
15 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16603
16 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16641
17 https://t.me/russiangomel/6489
18 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16648
19 https://t.me/russiangomel/6623
20 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16689
21 https://t.me/rcnkbrest/26176
22 https://t.me/russiangomel/6595
23 https://t.me/rcnkbrest/26010
24 https://t.me/russkiydomvgrodno/3368
25 https://t.me/russkiydomvgrodno/3414
26 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16682
27 https://t.me/rcnkbrest/26103
28 https://t.me/russkiydomvgrodno/3511
29 https://t.me/russiangomel/6622

**- навязванне расійскага погляду на гісторыю:** адкрыццё Еўразійскай канікулярнай школы «Гістарычная праўда» для настаўнікаў гісторыі[30], сустрэча гістарычнага клуба[31].

**- навязванне расійскай культуры:** свята татарскай культуры[32], святочны канцэрт для суайчыннікаў[33], выстава «Заходні Буг — рака часу»[34], мабільная планшэтная выстава «Шэдэўры Рускага музея»[35], міжнародны музычны фестываль «Свае»[36], «Вечар рускай культуры»[37], выстава, прысвечаная творчасці Валянціна Сярова[38].

**- навязванне расійскіх наратываў праз паказы фільмаў:** фільма «Пацаны батальёна “Усход”» у рамках фестывалю «RT. Док: Час нашых герояў»[39], фільма «Крым. Перараджэнне»[40], дакументальнага фільма «Ветэраны»[41], мастацкага фільма «Пазыўны “Пасажыр”»[42,43,44], фільмаў, прымеркаваных да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі[45].

- **У ідэалагічнай сферы адбываецца сакралізацыя савецкага мінулага, вялікая ўвага па-ранейшаму надаецца тэме Вялікай айчыннай вайны:**

  - У год 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў Беларусі плануецца рэалізаваць больш за 150 мерапрыемстваў[46,47].

  - Міністэрства культуры Беларусі зацвердзіла лагатып 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне[48].

  - Мінлясгас складзе дрэвамі ідэалагічны надпіс «9 Мая», які будзе відаць з самалётаў[49].

  **Мерапрыемствы, прысвечаныя ВАВ:** мерапрыемства «Жаночы твар Вялікай Перамогі» (музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны)[50]; акцыя «Разам з мастацтвам» — «Слава Пераможцам!» (Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў)[51]; цыкл круглых сталоў «Вехі Вялікай Айчыннай вайны» (Нацыянальная бібліятэка Беларусі)[52]; дыскусія «Пытанні патрыятычнага выхавання і захавання гістарычнай памяці. Праекты Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у год 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне» (Нацыянальны прэс-цэнтр Рэспублікі Беларусь)[53]; маштабны форум «Памяць і інавацыі. Гісторыя Вялікай Перамогі ў сучасных мультымедыя» (музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны)[54]; нацыянальны фестываль патрыятычнай песні «Салдацкі канверт» (Дом Масквы ў Мінску)[55]; паказы для старшакласнікаў ваенна-патрыятычнага праекта «Лінія памяці. Код вайны» (БДУКіМ)[56]; дзіцячы конкурс

---

30 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16757
31 https://t.me/russiangomel/6615
32 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16550
33 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16576
34 https://t.me/rcnkbrest/26027
35 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16564
36 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16674
37 https://t.me/russiangomel/6722
38 https://t.me/russiangomel/6643
39 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16669
40 https://t.me/russiangomel/6528
41 https://t.me/russkiydomvgrodno/3554
42 https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16730
43 https://t.me/russkiydomvgrodno/3611
44 https://t.me/rcnkbrest/26161
45 https://t.me/russiangomel/6686
46 https://t.me/belpresscenter/3369
47 https://belta.by/society/view/vystavki-lektsii-konferentsii-minkultury-zaplanirovalo-bolee-150-meroprijatij-k-80-letiju-pobedy-705240-2025/
48 https://t.me/minkultrb/50641
49 https://belta.by/regions/view/minleshoz-sdelaet-iz-sazhentsev-zhivuju-nadpis-9-maja-v-kirovskom-rajone-705511-2025/
50 https://t.me/minkultrb/49947
51 https://t.me/minkultrb/50142
52 https://t.me/minkultrb/50412
53 https://t.me/minkultrb/50505
54 https://t.me/warmuseumby/2291
55 https://minsknews.by/naczionalnyj-festival-patrioticheskoj-pesni-soldatskij-konvert-prohodit-v-minske/
56 https://t.me/bguki/27435

вакальнай творчасці «Сэрца спявае — Перамога жыве» (музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны)[57].

**Выставы, прысвечаныя ВАВ:** «Танкавая майстэрня» (музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны)[58], «За мірнае неба!» (Нацыянальная бібліятэка Беларусі)[59], «Вайна не змагла забраць толькі каханне» (Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь»)[60].

- **Беларуская гістарыяграфія ўсё болей прывязваецца да расійскай.**

  - Памочнік Прэзідэнта Расіі Уладзімір Мядзінскі заявіў, што Масква і Мінск супрацоўнічаюць у распрацоўцы падручнікаў па гісторыі[61,62].

  - У Мінску адкрылі помнік воінам Рускай імператарскай арміі[63].

  - Памочнік Пуціна Мядзінскі хоча паставіць у Беларусі помнік расійскаму фельдмаршалу Івану Паскевічу — душыцелю паўстання 1830-31 гадоў, а таксама савецкаму маршалу Канстанціну Ракасоўскаму[64].

  - На Магілёўшчыне рыхтуюць экскурсійны тур «Царскімі шляхамі» па месцах, якія наведвалі расійскія імператары[65].

- **Па-ранейшаму назіраецца папулярызацыя рускай мовы і стварэнне адзінай (руска)моўнай прасторы.**

  За сакавік 2025 года афіцыйны тэлеграм-канал[66] Міністэрства культуры апублікаваў 196 навін (у папярэдніх двух месяцах — 363 і 212). Калі звярнуць увагу на мову паведамленняў, змешчаных у тэлеграм-канале, то асноўнай мовай па-ранейшаму застаецца руская.

| **Мова паведамленняў** | **колькасць навін** |
|---|---|
| Руская | 170 |
| Беларуская | 23 |
| Абедзве | 3 |

  - Прарасійскі палітолаг і заходнерусіст Усевалад Шымаў абурыўся маёнткам «Сула»: Увесь персанал гаворыць выключна па-беларуску і на рускую не пераходзіць[67].

  - Для бібліятэкі імя Караткевіча ў Рагачове закупляюць тысячы кніг, але ніводнай на беларускай мове[68].

[57] https://t.me/warmuseumby/2304
[58] https://t.me/minkultrb/49943
[59] https://t.me/libraryofbel/7342
[60] https://t.me/kultinfa/11712
[61] https://t.me/Associationedu/1216
[62] https://reform.news/medinskij-priehal-v-minsk-vypleskivat-russkuju-kulturu-vovne
[63] https://nashaniva.com/363745
[64] https://nashaniva.com/363765
[65] https://nashaniva.com/364506
[66] https://t.me/MinobrofBelarus
[67] https://nashaniva.com/362858
[68] https://d3h22ms60ks0ut.cloudfront.net/by/naviny/nivodnaj-belaruskaj-knigi-dlja-biblijateki-imja-karatkevicha-w-ragachove-zakupljajuc-tysjachy-knig.html

- **Беларуская нацыянальная культура ўсё больш прывязваецца да расійскай і працягвае існаваць ва ўмовах рэпрэсій і забарон.**

  - Лукашэнка забараніў міністру культуры прымаць на працу нават самых таленавітых дзеячаў, калі тыя выступалі супраць рэжыму[69].

  - Імёны мастакоў на фестывалі «Арт-Мінск» зноў прапусцілі скрозь «сіта» цэнзуры[70].

  - Кнігу «Выпадковы прэзыдэнт», старонкі «Арт-Сядзібы» і Славы Камісаранкі прызналі «экстрэмісцкімі»[71].

  - У Беларусі абнавілі спіс забароненых да распаўсюду кніг — сярод іх Мітчэл, Бакман і Муракамі[72].

  - Пасля нападак праўладных актывістаў у Мінску закрылі выставу «Беларускі бестыярый»[73].

  - Быў адменены купальскі фестываль у Дудутках «Свята сонца»[74,75].

  - Пасля ўмяшання Бондаравай у Дудутках скасавалі фэст на Купалле[76].

  ***Беларуская літаратура:***

  - Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш ператварылася ў ідэалагічнае прапагандысцкае мерапрыемства[77].

  - На Нацыянальным конкурсе «Мастацтва кнігі» ў рамках XXXII Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу Нацыянальная бібліятэка Беларусі была ўзнагароджана дыпломам I ступені ў намінацыі «Сіла ў праўдзе і адзінстве» за масава-палітычнае выданне «Данбас — Наваросія: беларускі погляд»[78].

  ***Нацыянальны тэатр і кінаіндустрыя:***

  - У Магілёве адкрыўся Міжнародны маладзёжны тэатральны форум «M.@rt.кантакт» — амаль цалкам з расійскай праграмай і мінімальнай колькасцю беларускіх спектакляў[79].

  - Стала вядома, што з 15 па 20 красавіка ў Магілёве пройдуць гастролі Уладзімірскага акадэмічнага абласнога тэатра драмы[80].

  - Балетнае лета ў Беларусі адкрые Прыморская сцэна Марыінскага тэатра[81].

  - У Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа (г. Віцебск) адбыўся прэм’ерны паказ спектакля «ДАМЫ і ГУСАРЫ» па п’есе драматурга

[69] https://nashaniva.com/362888
[70] https://reform.news/imjony-mastako-na-festyvali-art-minsk-zno-prapuscili-skroz-sita-cjenzury
[71] https://www.svaboda.org/a/33358285.html
[72] https://t.me/viasna96/30317
[73] https://nashaniva.com/363702
[74] https://reform.news/admeneny-kupalski-festyval-u-dudutkah-svjata-sonca
[75] https://www.svaboda.org/a/33353765.html
[76] https://www.svaboda.org/a/33353765.html
[77] https://reform.news/uroki-donbassa-kevlarovyj-vek-institut-prezidentskoj-vlasti-i-kniga-pra-kosmas-shto-nasamrjech-prjezentujuc-na-minskaj-mizhnarodnaj-knizhnaj-vystave-kirmashy
[78] https://t.me/minkultrb/50227
[79] https://reform.news/u-magiljove-adkry-sja-mizhnarodny-maladzjozhny-tjeatralny-forum-m-rt-kantakt-amal-calkam-z-rasijskaj-pragramaj-i-minimalnaj-kolkascju-belaruskih-spektaklja
[80] https://t.me/kultinfa/11716
[81] https://belta.by/society/view/baletnoe-leto-v-belarusi-otkroet-primorskaja-stsena-mariinskogo-teatra-701603-2025/

Аляксандра Фрэдры ў пастаноўцы, сцэнаграфіі і музычным афармленні Аляксандра Бармака, заслужанага дзеяча мастацтваў Расійскай Федэрацыі[82].

- Вольга Няфёдава прызнала, што Купалаўскі тэатр дагэтуль не змог аднавіцца[83].

- Пермскі тэатр «Ля Моста» прадставіў спектакль «Звер» на сцэне Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імёны Янкі Купалы[84].

- Да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне Мінскі абласны драматычны тэатр падрыхтаваў прэм’еру «Сем трафеяў радавога Шапкіна»[85].

- Сталічны кінатэатр «Ракета» паказвае рэтраспектыву фільмаў савецкага і расійскага рэжысёра Аляксея Германа[86].

***Беларускае дойлідства:***

- Міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі лічыць, што будынкі XIX стагоддзя не адпавядаюць сучасным патрабаванням, таму дзяржаве трэба іх зносіць і будаваць на іх месцы новыя[87].

- У Заслаўі знеслі да Дажынак карчму і краму, якія раней лічыліся помнікамі архітэктуры[88].

**Гэтыя тэндэнцыі могуць мець для Беларусі сур’ёзныя наступствы, паколькі яны накіраваны на страту яе самабытнасці, на стварэнне ўмоў для далейшай інтэграцыі з Расіяй. А пры адначаснай экспансіі расійскай культуры — і на знікненне ў ёй. Беларусь паступова страчвае сваю нацыянальную індывідуальнасць.**

[82] https://t.me/minkultrb/50461
[83] https://minsknews.by/dlya-menya-kupalovskij-eto-dusha-nashej-strany-olga-nefyodova-ob-energetike-teatra-otvetstvennosti-i-lyubvi/
[84] https://belta.by/culture/view/legendarnyj-spektakl-zver-predstavil-permskij-teatr-u-mosta-na-stsene-kupalovskogo-teatra-704675-2025/
[85] https://t.me/kultinfa/11764
[86] https://t.me/kultinfa/11710
[87] https://nashaniva.com/364555
[88] https://nashaniva.com/364311

**Лукашэнка забараніў міністру культуры прымаць на працу нават самых таленавітых дзеячаў, калі тыя выступалі супраць рэжыму, Цэнтр па забеспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый Магілёўскага раёна патлумачыў, навошта ў снежні 2024 года закупляў расійскія сцягі («Мы ж браты»), Пракуратура патлумачыла, чаму фільм пра сталінскія рэпрэсіі прызналі «экстрэмісцкім», прарасійскі палітолаг і заходнерусіст Усевалад Шымаў абурыўся маёнткам «Сула» («Увесь персанал гаворыць выключна па-беларуску і на рускую не пераходзіць»), праект Вялікага тэатра Беларусі «Патэтычны дзённік памяці» будзе прадстаўлены ў Маскве, у Магілёве пройдуць гастролі Уладзімірскага акадэмічнага абласнога тэатра драмы, сталічны кінатэатр «Ракета» паказвае рэтраспектыву фільмаў савецкага і расійскага рэжысёра Аляксея Германа, у Музеі гісторыі беларускага кіно адбыўся канцэрт «Я, вядома, вярнуся...», прысвечаны творчасці Уладзіміра Высоцкага, а ў Віцебскай абласной філармоніі прагучаць «Песні-хіты савецкага кіно» — навіны культуры за перыяд 1-10 сакавіка 2025 года.**

## Навінная павестка Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

За перыяд 1-10 сакавіка 2025 года на афіцыйным сайце[89] Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь была апублікавана 1 навіна, якая была прысвечана:

- конкурснаму адбору рэжысёрскіх канцэпцый рэспубліканскіх мерапрыемстваў, прысвечаных Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь[90].

Афіцыйны тэлеграм-канал[91] Міністэрства культуры за названы перыяд апублікаваў 59 навін. Калі звярнуць увагу на мову паведамленняў, змешчаных у тэлеграм-канале, то асноўнай мовай па-ранейшаму застаецца руская.

| **Мова паведамленняў** | **колькасць навін** |
|---|---|
| Руская | 52 |
| Беларуская | 4 |
| Абедзве | 3 |

**Тэматычны змест паведамленняў:**

[89] https://www.kultura.by/

[90] https://www.kultura.by/news/ministerstvo-kultury-obyavlyaet-konkursnyy-otbor-rezhisserskikh-kontseptsiy/

[91] https://t.me/MinobrofBelarus

• нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры — 9 навін;

• тэма Вялікай Айчыннай вайны — 9 навін;

• міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы культуры — 13 навін.

**Нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры:**

***Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Руслан Чарнецкі:***

- прыняў удзел у «Мінскай лыжні-2025» у Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту «Раўбічы»[92].

- правёў сустрэчу з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Турэцкай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Гючлю Джэмам Ышыкам[93,94].

- правёў асабісты прыём грамадзян, у ходзе якога разглядаліся пытанні і ўносіліся прапановы па развіццю кінематографа, канцэртнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь і прасоўванню беларускай культуры за мяжой[95].

- правёў рабочую сустрэчу з губернатарам Прыморскага краю Алегам Кажамякам. Бакі абмеркавалі арганізацыю сумесных праектаў[96].

***Намеснік Міністра культуры Рэспублікі Беларусь Сяргей Саракач:***

- прыняў удзел у «Мінскай лыжні-2025» у Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту «Раўбічы»[97].

***Начальнік упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Ірына Дашчынская:***

- прыняла ўдзел у выязным пасяджэнні калегіі галоўнага ўпраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама ў Чырвоным Беразе[98].

***Начальнік аддзела па кінематаграфіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Ірына Дрыга:***

- правяла «прамую тэлефонную лінію» па пытаннях кінематаграфіі[99].

[92] https://t.me/minkultrb/49817
[93] https://t.me/minkultrb/49894
[94] https://t.me/minkultrb/49896
[95] https://t.me/minkultrb/49915
[96] https://t.me/minkultrb/50062
[97] https://t.me/minkultrb/49817
[98] https://t.me/minkultrb/49932
[99] https://t.me/minkultrb/49973

**Тэме Вялікай Айчыннай вайны былі прысвечаны такія навіны:**

- у бібліятэках Гродзенскай вобласці стартуе відэачэлендж аб героях ВАВ «Імёны Перамогі». Для ўдзелу ў акцыі трэба падрыхтаваць відэазапісы з апавяданнямі аб партызанах, працаўніках тылу, дзецях вайны і ўсіх іншых, хто ўнёс свой уклад у барацьбу з фашыстамі[100].

- напярэдадні святкавання Дня жанчын у музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адбылося мерапрыемства «Жаночы твар Вялікай Перамогі». Удзельнікі мерапрыемства азнаёміліся з тэматычнай экспазіцыяй «Яны змагаліся за Радзіму», ад навуковага супрацоўніка музея даведаліся пра лёсы і подзвігі жанчын, удзельніц Вялікай Айчыннай вайны. «Мерапрыемства накіравана на захаванне гістарычнай памяці, выхаванне патрыятызму і фарміраванне дыялогу паміж пакаленнямі, натхняючы моладзь на павагу да мінулага і ўсведамленне сваёй адказнасці за будучыню»[101].

**Тэме міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры** былі прысвечаны 13 навін, якія закранулі кантакты з наступнымі краінамі:

Расія — 7 навін;

Кітай — 2 навіны;

Азербайджан — 2 навіны;

Турцыя — 1 навіна;

Узбекістан — 1 навіна.

***Расія:***

- стала вядома, што праект Вялікага тэатра Беларусі «Патэтычны дзённік памяці» будзе прадстаўлены 2 красавіка ў Маскве. Акрамя таго, творчы праект таксама будзе паказаны 1 траўня на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой»[102].

- у адпаведнасці з планам супрацоўніцтва паміж Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам культуры Расійскай Федэрацыі ў Гомельскім палацава-паркавым ансамблі адбылася прэзентацыя выставы «Аляксандр Сяргеевіч Грыбаедаў як з’ява рускай гісторыі і культуры». Выстава прадстаўлена Дзяржаўным гісторыка-культурным і прыродным музеем-запаведнікам А. С. Грыбаедава «Хмеліта» (Расійская Федэрацыя) і прысвечана літаратурнай дзейнасці і дыпламатычнай службе Грыбаедава[103].

- стала вядома, што з 4 па 9 красавіка Тэатр-фестываль «Балтыйскі дом» у дваццаць сёмы раз збярэ на сваёй сцэне рускія драматычныя тэатры з розных краін. Адкрые фестываль Брэсцкі акадэмічны тэатр драмы з пастаноўкай Аляксандра Козака «Не пакідай мяне» паводле твора Аляксея Дударава[104].

- Міністр культуры Руслан Чарнецкі правёў рабочую сустрэчу з губернатарам Прыморскага краю Алегам Кажамякам. Сустрэча прайшла ў Вялікім тэатры Рэспублікі

[100] https://t.me/minkultrb/49938
[101] https://t.me/minkultrb/49947
[102] https://t.me/minkultrb/49879
[103] https://t.me/minkultrb/49952
[104] https://t.me/minkultrb/49984

Беларусь. На сустрэчы таксама прысутнічалі народны артыст Расійскай Федэрацыі, мастацкі кіраўнік балетнай трупы Прыморскай сцэны Марыінскага тэатра Эльдар Аліеў і намеснік мастацкага кіраўніка-дырэктара Марыінскага тэатра Сяргей Баннікаў. Для гасцей генеральны дырэктар Вялікага тэатра Беларусі Кацярына Дулава правяла экскурсію па тэатры. За круглым сталом бакі абмеркавалі арганізацыю сумесных праектаў. Чакаецца, што расійскія артысты выступяць на сцэне Вялікага тэатра Беларусі ўжо гэтым летам. Плануецца паказ балетных пастановак «Тысяча і адна ноч» і «Карсар»[105].

***Кітай:***

- Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі наведала дэлегацыя Хайнаньскага педагагічнага ўніверсітэта. Падчас візіту адбылася сустрэча з рэктарам Акадэміі А. Куракінай. Удзельнікі сустрэчы закранулі пытанні, якія датычацца адукацыйных, творчых і навуковых праектаў у сферы музычнага мастацтва, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. Па выніках перагавораў была падпісана дамова аб двухбаковым супрацоўніцтве[106].

***Азербайджан:***

- стала вядома, што Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь упершыню прадставіць выставачны праект з калекцыі музея ў Азербайджанскай Рэспубліцы. 12 сакавіка ў Азербайджанскім нацыянальным музеі мастацтваў адбудзецца ўрачыстае адкрыццё выставы «Ю. Пэн, Я. Кругер. Ля вытокаў мастацкай адукацыі Беларусі»[107].

***Турцыя:***

- Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Руслан Чарнецкі правёў сустрэчу з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Турэцкай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Гючлю Джэмам Ышыкам. На сустрэчы абмяркоўвалася развіццё двухбаковага міжнароднага культурнага супрацоўніцтва дзвюх краін, асабліва турэцкі бок зацікаўлены ў супрацоўніцтве ў сферах тэатра, кіно і турызму. Са свайго боку Чарнецкі запэўніў аб гатоўнасці Рэспублікі Беларусь умацоўваць культурнае супрацоўніцтва і сяброўскія адносіны паміж дзвюма краінамі[108,109].

***Узбекістан:***

- Пасол Беларусі ва Узбекістане Аляксандр Агароднікаў правёў сустрэчу з Міністрам культуры Рэспублікі Узбекістан Азодбекам Назарбекавым. Бакі абмяняліся думкамі аб стане і перспектывах развіцця супрацоўніцтва дзвюх краін у сферы культуры, адзначылі высокі ўзровень узаемадзеяння па шырокім спектры напрамкаў, уключаючы супрацоўніцтва ў галіне кінематаграфіі, тэатральнай творчасці, удзел у фестывалях і выставачных мерапрыемствах[110].

[105] https://t.me/minkultrb/50062
[106] https://t.me/minkultrb/49990
[107] https://t.me/minkultrb/49988
[108] https://t.me/minkultrb/49894
[109] https://t.me/minkultrb/49896
[110] https://t.me/minkultrb/49921

## Дзейнасць расійскіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі

Расійскія арганізацыі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі (Рускі Дом у Гомелі, Рускі Дом у Мінску, Рускі Дом у Брэсце, Рускі Дом у Гродне), няспынна займаюцца прапагандай у гістарычнай сферы, усхваляюць савецкія каштоўнасці, спрыяюць інтэграцыйным працэсам Беларусі і Расіі, паслядоўна ўкараняюць у Беларусі расійскую культуру і рускую мову, перадаюць установам адукацыі і культуры камплекты кніг.

У перыяд з 1 па 10 сакавіка 2025 года расійскія арганізацыі былі ініцыятарамі ці (і) ўдзельнікамі такіх мерапрыемстваў і праектаў у Беларусі:

**- гістарычная лекцыя «У небе начныя ведзьмы» (Рускі Дом у Брэсце).** Навучэнцы сярэдняй школы № 20 ім. Карбышава даведаліся пра гісторыю 46-га Гвардзейскага палка начных бамбавікоў — жаночага падраздзялення часоў Вялікай Айчыннай вайны[111].

**- адкрытая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Карбышаўскія чытанні. Пошук, навука, практыка, якасць»** *(Сярэдняя школа № 15 імя Карбышава г. Гродна).* Навучэнцы агульнаадукацыйных устаноў з Беларусі, Расіі і Казахстана выступілі з дакладамі аб подзвігу савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З прывітальным словам да ўдзельнікаў мерапрыемства звярнуўся консул-дарадца Генеральнага консульства Расіі ў Гродне Гаўрыіл Мамантаў[112].

**- тэлемост Гродна — Калінінград «Жаночы твар Перамогі»** *(Рускі Дом у Гродне).* У мерапрыемстве, прысвечаным подзвігу жанчын у гады Вялікай Айчыннай вайны, прынялі ўдзел: Старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена Пасюта, першы намеснік Старшыні Заканадаўчага Сходу Калінінградскай вобласці Ларыса Швалкене, Генеральны консул Расіі ў Гродне Феадосій Уладышэўскі, кіраўнік Рускага Дома ў Гродне Алена Літвішэнка, кіраўнік Калінінградскага рэгіянальнага аддзялення «Саюза жанчын Расіі» Марына Мацюніна, старшыня праўлення Гродзенскай гарадской арганізацыі «Гродзенчанка» «Беларускага саюза жанчын» Ірына Луканская[113].

**- свята татарскай культуры** *(Рускі Дом у Мінску).* Мерапрыемства было прысвечана памяці кулінара Юнуса Ахметзянава. Свята пачалося з майстар-класа, дзе студэнты Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта пагрузіліся ў свет татарскіх прысмакаў, а працягнулася лекцыяй Наілі Галеевай, дырэктара моладзевага цэнтра «Ідэль» з Казані[114].

**- святочны канцэрт для суайчыннікаў** *(Рускі Дом у Мінску).* У праграме канцэрта прагучалі вядомыя песні з расійскіх і савецкіх папулярных фільмаў[115].

**- сустрэча размоўнага клуба «Рускі як замежны»** *(Рускі Дом у Гомелі).* Гасцямі на гэты раз сталі туркменскія студэнты філалагічнага факультэта ГДУ імя Ф. Скарыны. Удзельнікі мерапрыемства на тэму «Рускі свет у мастацтве. Музыка» слухалі народную, класічную і сучасную рускую музыку і абмяркоўвалі яе асаблівасці[116].

[111] https://t.me/rcnkbrest/26010
[112] https://t.me/russkiydomvgrodno/3368
[113] https://t.me/russkiydomvgrodno/3414
[114] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16550
[115] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16576
[116] https://t.me/russiangomel/6479

**- сустрэча з аўтарам паэтычных зборнікаў, членам Саюза пісьменнікаў Расіі Леанідам Сідаравым** *(Рускі Дом у Мінску)*[117].

**- выстава «Заходні Буг — рака часу»** *(музей гісторыі Брэста).* Выстава стала магчымай дзякуючы супрацоўніцтву Генеральнага консульства Расіі ў Брэсце і Расійскай нацыянальнай бібліятэкі. Выступаючы на цырымоніі адкрыцця, Генеральны консул Расіі ў Брэсце Мурашаў падкрэсліў важнасць захавання агульнай культурнай спадчыны Расіі і Беларусі і адзначыў, што «такія праекты маюць асаблівую значнасць для нашых народаў і абавязкова будуць прадоўжаны»[118].

**- мабільная планшэтная выстава «Шэдэўры Рускага музея»** *(Мастацкая галерэя Міхаіла Савіцкага).* Выстава прайшла пры падтрымцы Рускага Дома ў Мінску і пазнаёміла з асноўнымі этапамі развіцця рускага выяўленчага мастацтва[119].

## Агляд асноўных падзей, якія адбываліся ў Беларусі ў сферы культуры і гістарыяграфіі цягам 1-10 сакавіка 2025 года і маюць дачыненне да фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці

Пры адборы галоўных тэм гэтага перыяду разглядаліся навіны культуры, апублікаваныя не толькі на рэсурсах профільнага Міністэрства, але і ў СМІ, тэлеграм-каналах іншых органаў кіравання культуры.

**Сярод навіннай павесткі можна вылучыць наступныя асноўныя падзеі:**

***

**Лукашэнка забараніў міністру культуры прымаць на працу нават самых таленавітых дзеячаў, калі тыя выступалі супраць рэжыму.**

Аляксандр Лукашэнка ў часе кадравых назначэнняў у сацыяльны блок урада выказаўся наконт таго, як ставіцца да работнікаў тых або іншых сфер, якія выступалі супраць рэжыму. Лукашэнка лічыць, што тым, хто працуе ў адукацыі, СМІ, культуры, спорце, даравадь выступы 2020 года нельга. Ён адмыслова звярнуўся да міністра культуры не прабачаць нават самых таленавітых. *«Таму, Руслан, калі ў цябе там ёсць нейкія хістанні (ну як, гэта вось ён у кінематаграфіі можа кіно зняць, больш ніхто…), трэба гэта спыніць. Ты — дзяржаўны чалавек. Яны павінны быць такія, як ты. Вось і ўся размова»,* — сказаў Лукашэнка[120].

***

**Цэнтр па забеспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый Магілёўскага раёна патлумачыў, навошта ў снежні 2024 года закупляў расійскія сцягі: «Мы ж браты».**

---

[117] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16586
[118] https://t.me/rcnkbrest/26027
[119] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16564
[120] https://nashaniva.com/362888

Усяго тады набылі 40 расійскіх сцягоў, па два на кожную школу ў раёне. Кажуць, што іх выстаўлялі ў фае нават падчас беларускіх прэзідэнцкіх выбараў. На гэта звярнуў увагу тэлеграм-канал «Витебск, я гуляю». *«Сцягі ў нас закупляліся перад выбарамі: і беларускія, і расійскія. Як гэта "навошта расійскія"? Мы ж браты,* — патлумачылі ў цэнтры. — *Калі ў школе быў выбарчы ўчастак, у той час і выстаўляліся сцягі. У нас, як правільна вам сказаць… Расія і Беларусь — гэта ж два адзінствы. Усё гэта мусіць быць. Яшчэ ж 2 красавіка будзе Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі»*[121].

***

**Пракуратура патлумачыла, чаму фільм пра сталінскія рэпрэсіі прызналі «экстрэмісцкім».**

Раней стала вядома, што ютуб-канал «1142Х» і размешчаны на ім фільм «Лес» былі прызнаныя «экстрэмісцкімі матэрыяламі». Рашэнне прыняў суд па заяве намесніка пракурора Гомельскай вобласці. Пракуратура лічыць, што стваральнікі відэа *«катэгарычна адмаўлялі вынікі расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа». «У прыватнасці, адмаўлялі той факт, што знойдзеныя следчай групай Генпракуратуры падчас палявых работ астанкі целаў належалі ахвярам, расстраляным фашыстамі ў часы вайны. На відэа псеўдаэксперты-гісторыкі заяўлялі, што на месцы пахавання знойдзеныя рэшткі людзей, рэпрэсаваных савецкай уладай у 30-х гадах мінулага стагоддзя»,* — заявіў начальнік упраўлення Генпракуратуры Дзмітрый Брылёў. На канале таксама нібыта размешчаны іншыя відэа, якія *«спрыяюць скажэнню гістарычнай праўды і накіраваны на падрыў аўтарытэту дзейнай улады і яе прадстаўнікоў»*[122].

***

**Прарасійскі палітолаг і заходнерусіст Усевалад Шымаў абурыўся маёнткам «Сула»: Увесь персанал гаворыць выключна па-беларуску і на рускую не пераходзіць.**

Ён наведаўся ў парк гісторыі «Сула» разам з маскоўскімі сябрамі. *«У прынцыпе, убачыў я там тое, што і чакаў — такі ліцвінскі лубок з закосам пад Еўропу. Сам парк забудаваны лубочнымі новабудоўлямі пад сярэднявечную Літву. Усярэдзіне разнастайныя тэматычныя экспазіцыі. Увесь персанал мае зносіны выключна па-беларуску і на рускую не пераходзіць, нават калі звяртаешся да іх па-руску»,* — адзначыў Шымаў. Не спадабалася яму і тое, што першадрукар Іван Фёдараў ператварыўся ў Федаровіча, а персанал *«апрануты ў шляхецкія касцюмы»*[123].

***

**Праект Вялікага тэатра Беларусі «Патэтычны дзённік памяці» будзе прадстаўлены 2 красавіка ў Маскве.**

---

121 https://nashaniva.com/363509
122 https://reform.news/prokuratura-objasnila-pochemu-film-o-stalinskih-repressijah-priznali-jekstremistskim
123 https://nashaniva.com/362858

Акрамя таго, творчы праект таксама будзе паказаны 1 мая на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой»[124].

***

**Стала вядома, што з 15 па 20 красавіка ў Магілёве пройдуць гастролі Уладзімірскага акадэмічнага абласнога тэатра драмы[125].**

***

**Сталічны кінатэатр «Ракета» паказвае рэтраспектыву фільмаў савецкага і расійскага рэжысёра Аляксея Германа.**

У праграме — паказ фільмаў «Мой сябар Іван Лапшын», «Праверка на дарогах», «Хрусталёў, машыну!» і «Цяжка быць богам»[126].

***

**У Музеі гісторыі беларускага кіно адбыўся канцэрт «Я, вядома, вярнуся...», прысвечаны творчасці Уладзіміра Высоцкага[127], а 22 сакавіка ў Віцебскай абласной філармоніі прагучаць «Песні-хіты савецкага кіно»[128].**

***

**Выставы, на якія варта звярнуць увагу:**

**- выстава «Танкавая майстэрня»** *(музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны)*. На выставе прадстаўлены стэндавыя мадэлі і ваенна-гістарычная мініяцюры ваеннай тэхнікі. Выстава арганізавана сумесна з ЦДАДіМ «Вікторыя», пры падтрымцы праекта «Свет танкаў»[129].

**- выставачны праект «За мірнае неба!»** *(Нацыянальная бібліятэка Беларусі)*[130].

**- выстава «Вайна не змагла забраць толькі каханне»** *(Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь»)*[131].

---

[124] https://t.me/kultinfa/11660
[125] https://t.me/kultinfa/11716
[126] https://t.me/kultinfa/11710
[127] https://t.me/kultinfa/11691
[128] https://t.me/kultinfa/11676
[129] https://t.me/minkultrb/49943
[130] https://t.me/libraryofbel/7342
[131] https://t.me/kultinfa/11712

**Памочнік Прэзідэнта Расіі Уладзімір Мядзінскі заявіў, што Масква і Мінск супрацоўнічаюць у распрацоўцы падручнікаў па гісторыі, а таксама выказаў жаданне паставіць у Беларусі помнік расійскаму фельдмаршалу Івану Паскевічу — душыцелю паўстання 1830-31 гадоў, і савецкаму маршалу Канстанціну Ракасоўскаму, тым часам у Мінску адкрылі помнік воінам Рускай імператарскай арміі, Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш ператварылася ў ідэалагічнае прапагандысцкае мерапрыемства, у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прайшоў маштабны форум «Памяць і інавацыі. Гісторыя Вялікай Перамогі ў сучасных мультымедыя», у Доме Масквы ў Мінску прайшоў Нацыянальны фестываль патрыятычнай песні «Салдацкі канверт», у БДУКіМ адбыліся паказы для старшакласнікаў ваенна-патрыятычнага праекта «Лінія памяці. Код вайны», у Магілёве адкрыўся Міжнародны маладзёжны тэатральны форум «М.@rt.кантакт» — амаль цалкам з расійскай праграмай і мінімальнай колькасцю беларускіх спектакляў, балетнае лета ў Беларусі адкрые Прыморская сцэна Марыінскага тэатра, пасля нападак праўладных актывістаў у Мінску закрылі выставу «Беларускі бестыярый» і быў адменены купальскі фестываль у Дудутках «Свята сонца» — навіны культуры за перыяд 11-20 сакавіка 2025 года.**

## Навінная павестка Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

За перыяд 11-20 сакавіка 2025 года на афіцыйным сайце[132] Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь былі апублікаваны 4 навіны, якія былі прысвечаны:

- рабочай сустрэчы Міністра культуры Рэспублікі Беларусь Руслана Чарнецкага з губернатарам Прыморскага краю Расійскай Федэрацыі Алегам Кажамякам[133];

- Пасяджэнню Рэспубліканскай камісіі па разглядзе кандыдатур, якія вылучаюцца для прадастаўлення грантаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь[134];

- беларускаму нацыянальнаму адбору да фестывалю «Славянскі базар»[135];

- рабочай сустрэчы Міністра культуры Рэспублікі Беларусь Руслана Чарнецкага з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь Рахматулай Назаравым[136].

[132] https://www.kultura.by/

[133] https://www.kultura.by/news/10-marta-ministr-kultury-zasluzhennyy-artist-respubliki-belarus-ruslan-iosifovich-chernetskiy-segodn/
[134] https://www.kultura.by/news/11-marta-sostoyalos-zasedanie-respublikanskoy-komissii-po-rassmotreniyu-kandidatur-vydvigaemykh-dlya/
[135] https://www.kultura.by/news/stali-izvestny-predstaviteli-belarusi-na-slavyanskom-bazare-v-vitebske-v-2025-godu/
[136] https://www.kultura.by/news/ministr-kultury-zasluzhennyy-artist-respubliki-belarus-ruslan-iosifovich-chernetskiy-provyel-rabochu/

Афіцыйны тэлеграм-канал[137] Міністэрства культуры за названы перыяд апублікаваў 57 навін. Калі звярнуць увагу на мову паведамленняў, змешчаных у тэлеграм-канале, то асноўнай мовай па-ранейшаму застаецца руская.

| **Мова паведамленняў** | **колькасць навін** |
|---|---|
| Руская | 50 |
| Беларуская | 7 |
| Абедзве | 0 |

**Тэматычны змест паведамленняў:**

• нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры — 7 навін;

• тэма Вялікай Айчыннай вайны — 9 навін;

• міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы культуры — 11 навін.

**Нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры:**

***Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Руслан Чарнецкі:***

- азнаёміў намесніка Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Караніка з праектамі ў сферы культуры на пасяджэнні Рэспубліканскай камісіі па разглядзе кандыдатур, якія выстаўляюцца для прадастаўлення грантаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь[138].

- прыняў удзел ва ўрачыстай цырымоніі перадачы раяля «Беларусь» Мінскаму дзяржаўнаму музычнаму каледжу ім. Глінкі[139].

- павіншаваў беларусаў з Днём Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь[140].

- правёў рабочую сустрэчу з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь Рахматулам Назаравым[141].

- накіраваў прывітальны адрас удзельнікам і гасцям XVIII Міжнароднага маладзёжнага тэатральнага форуму «M@rt.кантакт»[142].

**Тэме Вялікай Айчыннай вайны былі прысвечаны такія навіны:**

---

[137] https://t.me/MinobrofBelarus

[138] https://t.me/minkultrb/50075
[139] https://t.me/minkultrb/50081
[140] https://t.me/minkultrb/50225
[141] https://t.me/minkultrb/50288
[142] https://t.me/minkultrb/50338

- стала вядома, што Мінскі абласны драматычны тэатр вядзе працу над прэм’ерным спектаклем «Сем трафеяў радавога Шапкіна» паводле п’есы Васіля Ткачова, рэжысёр-пастаноўшчык — Раман Цыркін. Прэм’еру прадставяць 27 сакавіка 2025 года[143].

- у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў працягнулася правядзенне акцыі «Разам з мастацтвам» — «Слава Пераможцам!». У холе ўстановы размясцілася тэматычная выстава работ, прысвечаных Вялікай Перамозе. *«Мэта акцыі — падкрэсліць уклад беларускага народа і дзеячаў культуры ў Вялікую Перамогу, аддаць даніну памяці Героям, якія змагаліся і працавалі дзеля працвітання нашай краіны»*[144].

- у рамках праекта «Жывая памяць удзячных пакаленняў» у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі была ўсталявана колба для збору манет на стварэнне ўсенароднага помніка на Паклоннай гары ў Маскве[145].

- у Беразіне і Чэрвені прайшла акцыя «Разам з мастацтвам». Мэта акцыі — падкрэсліць уклад беларускага народа і дзеячаў культуры ў Перамогу[146].

**Тэме міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры** былі прысвечаны 11 навін, якія закранулі кантакты з наступнымі краінамі:

Расія — 7 навін;

Азербайджан — 1 навіна;

Узбекістан — 1 навіна;

Бурундзі — 1 навіна;

Арменія — 1 навіна.

***Расія:***

- у Саранскім музычным вучылішчы імя Кірукова (Рэспубліка Мардовія) адбыўся конкурс «Юны віртуоз», у якім прынялі ўдзел больш за 150 удзельнікаў з розных рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь. Сумесная работа ўстаноў адукацыі развіваецца на аснове дамовы аб супрацоўніцтве ў сферы культурнай, адукацыйнай і навуковай дзейнасці і Плана мерапрыемстваў на 2023-2025 гады па рэалізацыі Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Мардовія аб гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным і культурным супрацоўніцтве[147].

- у «Шолахаў-Цэнтры» Дзяржаўнага музея-запаведніка М. А. Шолахава (г. Растоў-на-Доне) адбылося адкрыццё перасоўнай літаратурна-дакументальнай выставы «Крывёю сэрца», прадстаўленай Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры. Ва ўступных прамовах прадстаўнікі двух музеяў *«падзяліліся развагамі пра вялікую ролю пісьменнікаў і мастацкага слова ў барацьбе з фашысцкай навалай, выказалі думкі пра важнасць і сімвалічнасць выставы ў год 80-годдзя Перамогі»*[148].

[143] https://t.me/minkultrb/50116
[144] https://t.me/minkultrb/50142
[145] https://t.me/minkultrb/50259
[146] https://t.me/minkultrb/50294
[147] https://t.me/minkultrb/50231
[148] https://t.me/minkultrb/50246

- на сцэне Дзелавога і культурнага комплексу Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі прайшоў святочны канцэрт, прысвечаны Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. На мерапрыемстве прысутнічалі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі Аляксандр Рагожнік і дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў[149].

- у рамках візіту дэлегацыі Рэспублікі Беларусь ва Уладзімірскую вобласць Расійскай Федэрацыі адбыліся перагаворы з Міністрам культуры Уладзімірскай вобласці В. Дзёмінай. У ходзе перагавораў бакі дамовіліся аб распрацоўцы і падпісанні пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствамі культуры Рэспублікі Беларусь і Уладзімірскай вобласці на 2026-2028 гады. Дасягнута дамоўленасць аб арганізацыі паказаў ва Уладзімірскай вобласці новых фільмаў Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». Таксама ў рамках пасяджэння Савета па культуры і мастацтве пры Губернатары Уладзімірскай вобласці адбылося падпісанне Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальнай кінастудыяй «Беларусьфільм» і Дзяржаўнай бюджэтнай установай культуры «Кінацэнтр». Пагадненне прадугледжвае правядзенне Дзён Беларускага кіно ва Уладзімірскай вобласці і арганізацыю паказаў фільмаў беларускай вытворчасці[150].

***Азербайджан:***

- у Азербайджанскім нацыянальным музеі мастацтваў адбылося адкрыццё выставы «Ю. Пэн, Я. Кругер. Ля вытокаў мастацкай адукацыі ў Беларусі», якая ўпершыню прадстаўляе знакамітыя шэдэўры з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі ў Азербайджане. Ва ўрачыстай цырымоніі прынялі ўдзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Азербайджанскай Рэспубліцы Дзмітрый Піневіч, генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Ганна Конанава, дырэктар Азербайджанскага нацыянальнага музея мастацтваў Шырын Мелікава, вядомыя мастакі і дзеячы культуры Азербайджана[151].

***Узбекістан:***

- Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Руслан Чарнецкі правёў рабочую сустрэчу з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь Рахматулам Назаравым. На сустрэчы было адзначана, што ў народаў Беларусі і Узбекістана агульныя каштоўнасці і агульная культурная прастора. Адной з тэм, якія аб’ядноўваюць, з’яўляецца агульны ўклад у Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне. Бакі абмеркавалі вынікі супрацоўніцтва ў сферы культуры паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Узбекістан, а таксама намецілі новыя праекты і напрамкі для ўзаемадзеяння ў будучым. Напрыклад, у верасні бягучага года плануецца правядзенне Дзён Культуры Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Узбекістан. Былі таксама абмеркаваны перспектывы арганізацыі абменных гастроляў тэатраў, мастацкіх выставак, прысвечаных 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, і сумеснай кінавытворчасці[152].

***Бурундзі:***

[149] https://t.me/minkultrb/50272
[150] https://t.me/minkultrb/50335
[151] https://t.me/minkultrb/50152
[152] https://t.me/minkultrb/50288

- Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Бурундзі ў Расійскай Федэрацыі і па сумяшчальніцтве ў Рэспубліцы Беларусь Жозэф Нкурунзіз наведаў Цэнтр культуры «Віцебск», дзе абмяркоўваліся магчымасці супрацоўніцтва і ўдзелу прадстаўнікоў краіны ў Міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску»[153].

## Дзейнасць расійскіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі

Расійскія арганізацыі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі (Рускі Дом у Гомелі, Рускі Дом у Мінску, Рускі Дом у Брэсце, Рускі Дом у Гродне), няспынна займаюцца прапагандай у гістарычнай сферы, усхваляюць савецкія каштоўнасці, спрыяюць інтэграцыйным працэсам Беларусі і Расіі, паслядоўна ўкараняюць у Беларусі расійскую культуру і рускую мову, перадаюць установам адукацыі і культуры камплекты кніг.

У перыяд з 11 па 20 сакавіка 2025 года расійскія арганізацыі былі ініцыятарамі ці (і) ўдзельнікамі такіх мерапрыемстваў і праектаў у Беларусі:

**- лекторый, прымеркаваны да 80-й гадавіны Вялікай Перамогі** *(Нацыянальная бібліятэка Беларусі).* Прайшоў пры падтрымцы Рускага Дома ў Мінску. Першая з сямі запланаваных лекцый з удзелам вядучых гісторыкаў Саюзнай дзяржавы была прысвечана трагедыі і подзвігам 1941 года. Мадэратар адкрытай пляцоўкі — дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Сяргей Клішэвіч[154].

**- сустрэча ў рамках праекта «Урокі жывой гісторыі»** *(Рускі Дом у Брэсце).* Бярозаўская раённая арганізацыя грамадскага аб’яднання «Беларускі саюз афіцэраў» (г. Бяроза, Брэсцкая вобласць) і ваенна-гістарычны клуб «Гарнізон» прадставілі школьнікам інтэрактыўны занятак, прысвечаны подзвігу ўрачоў і медсясцёр у гады Вялікай Айчыннай вайны. Дзеці не толькі слухалі апавяданні, але і змаглі прымерыць ваенную форму[155].

**- інтэрактыўная гульня «100 вялікіх дасягненняў: ці ведаеце Вы іх?»** *(Гродна).* Мерапрыемства, арганізаванае супрацоўнікамі Рускага Дома для навучэнцаў ваенна-патрыятычнага класа сярэдняй школы № 15 ім. Д. М. Карбышава г. Гродна, было прысвечана ваенным дасягненням Вялікай Айчыннай вайны, а таксама сучаснаму ваеннаму ўзбраенню, здольнаму *«вырашаць важныя стратэгічныя задачы».* Дзеці паглядзелі фільм RT Documentary «Беларусь: дарога да свабоды», а пасля прынялі ўдзел у віктарыне аб ваенным узбраенні[156].

**- Міжнародны музычны фестываль «Свае»** *(духоўна-асветніцкі цэнтр «Каўчэг»).* Сваю фестывальную праграму прадставіў творчы калектыў з так званай Луганскай Народнай Рэспублікі[157].

**- перадача ў фонды школьных бібліятэк вучэбнай і мастацкай літаратуры расійскіх аўтараў** *(Брэст).* Рускі Дом у Брэсце перадаў 400 тамоў навучальнай і мастацкай літаратуры расійскіх аўтараў для папаўнення фондаў школьных бібліятэк ДУА «Сярэдняя школа № 16 ім. Героя Савецкага Саюза А. М. Карасёва» і ДУА «Сярэдняя адукацыйная школа №25 г. Брэста»[158].

---

[153] https://t.me/minkultrb/50327
[154] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16682
[155] https://t.me/rcnkbrest/26103
[156] https://t.me/russkiydomvgrodno/3511
[157] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16674
[158] https://t.me/rcnkbrest/26123

**- літаратурны турнір для школьнікаў на веданне рускіх пісьменнікаў** *(бібліятэка № 6 г. Магілёва).* Прайшоў пры падтрымцы Рускага Дома ў Мінску[159].

**- музычна-паэтычны канцэрт «Вялікае рускае слова»** *(Рускі Дом у Мінску)[160].*

**- літаратурная сустрэча «Мама для Маманцяня»** *(дзіцячы садок № 108 г. Гомеля).* У рамках літаратурна-адукацыйнага праекта «У свеце казак з Рускім Домам у Гомелі» супрацоўнікі цэнтра наведалі дзіцячы садок № 108, дзе пазнаёмілі дзяцей з казкай расійскай пісьменніцы Дзіны Няпомняшчай «Мама для Маманцяня»[161].

**- фінал нацыянальнага беларускага этапу Міжнароднага конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка»** *(прэс-цэнтр «Sputnik. Беларусь»).* Юныя беларускія чытальнікі выбралі ўрыўкі з твораў Марыны Дружынінай, Юрыя Якаўлева, Анатоля Прыстаўкіна, Чынгіза Айтматава і іншых рускіх аўтараў. Усе ўдзельнікі атрымалі ў падарунак ад Рускага Дома ў Мінску выданні рускай класічнай літаратуры[162].

**- паказ фільма «Пацаны батальёна “Усход”» у рамках фестывалю «RT. Док: Час нашых герояў»** *(Рускі Дом у Мінску)[163].*

**- паказ фільма «Крым. Перараджэнне»** *(Рускі Дом у Гомелі)[164].*

**- відэапаказ кінаклуба «Афіша»** *(Рускі Дом у Гомелі).* Навучэнцам старэйшых класаў сярэдняй школы № 26 г. Гомеля былі прапанаваны кароткаметражныя відэа, створаныя тэлеканалам БелРос у рамках праекта «Саюзная дзяржава: людзі, падзеі, факты». У відэапраекце расказваецца аб ключавых дасягненнях інтэнсіўнай інтэграцыі за чвэрць стагоддзя[165].

**- паказ дакументальнага фільма «Ветэраны»** *(Рускі Дом у Гродне).* Дакументальны праект Dобро&Zло production, аўтар і вядучы — Дзмітрый Задарожны, рэжысёр-пастаноўшчык — Даніла Шапарэнка, аператар-пастаноўшчык — Арцём Дзюнзэ. Закрыты паказ наведалі ветэраны сілавых структур Рэспублікі Беларусь, актыў РГА «Рускае грамадства» і Гродзенскай абласной арганізацыі Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі. *«Гэта гісторыя пра вайскоўцаў, якія працуюць на самых складаных, адказных участках фронту ў зоне спецыяльнай ваеннай аперацыі (СВА). Рызыкуючы сабой, яны адстойваюць дзяржаўныя і нацыянальныя інтарэсы. Яны не былі мабілізаваны. Яны пайшлі змагацца за краіну па клічы сэрца»[166].*

**- выстава адной фатаграфіі з серыі фотаработ «Мы абвінавачваем!»,** якая *«дэманструе наступствы ўдараў кіеўскага рэжыму па мірным насельніцтве расійскіх рэгіёнаў» (Рускі Дом у Гродне).* Аўтарамі праекта «Мы абвінавачваем!» выступілі Пасол па асобых даручэннях МЗС Расіі Радзіён Мірошнік і член Саюза журналістаў Расіі Сяргей Веняўскі[167].

**- выстава «Крым і Севастопаль. Пачуццё Радзімы»** *(Рускі Дом у Брэсце)[168].*

---

[159] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16603
[160] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16641
[161] https://t.me/russiangomel/6489
[162] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16648
[163] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16669
[164] https://t.me/russiangomel/6528
[165] https://t.me/russiangomel/6581
[166] https://t.me/russkiydomvgrodno/3554
[167] https://t.me/russkiydomvgrodno/3484
[168] https://t.me/rcnkbrest/26129

**Агляд асноўных падзей, якія адбываліся ў Беларусі ў сферы культуры і гістарыяграфіі цягам 11-20 сакавіка 2025 года і маюць дачыненне да фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці**

Пры адборы галоўных тэм гэтага перыяду разглядаліся навіны культуры, апублікаваныя не толькі на рэсурсах профільнага Міністэрства, але і ў СМІ, тэлеграм-каналах іншых органаў кіравання культуры.

**Сярод навіннай павесткі можна вылучыць наступныя асноўныя падзеі:**

***

**Памочнік Прэзідэнта Расіі Уладзімір Мядзінскі заявіў, што Масква і Мінск супрацоўнічаюць у распрацоўцы падручнікаў па гісторыі.**

Ён распавёў, што некаторыя раздзелы новага падручніка, якія тычацца падзей, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі, альбо з удзелам гістарычных дзеячаў краіны, адпраўляліся ў Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук рэспублікі для карэкціроўкі. Уладзімір Мядзінскі выказаў надзею, што гэты працэс сінхранізацыі падручнікаў гісторыі для школ Расіі і Беларусі будзе працягвацца[169]. Расійскі чыноўнік сустрэўся з кіраўніком Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Дзмітрыем Крутым, каб абмеркаваць дзейнасць сумеснай расійска-беларускай камісіі па гісторыі і яе працоўнага органа — Экспертна-кансультатыўнага расійска-беларускага савета па гісторыі. Дзмітрый Круты, у сваю чаргу, звярнуў увагу, што на пачатку дзейнасці расійска-беларускай камісіі па гісторыі ў яе ўдзельнікаў было чаканне, што большая частка працы будзе так ці інакш прысвечана тэматыцы Вялікай Айчыннай вайны. Аднак цяпер відавочна, што гэтая тэматыка значна шырэйшая і ў полі зроку спецыялістаў ужо падзеі Першай сусветнай вайны, вайны 1812 года[170].

***

**У Мінску адкрылі помнік воінам Рускай імператарскай арміі.**

У гэтым узялі ўдзел памочнік прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна і старшыня Расійскага ваенна-гістарычнага таварыства (РВІА) Уладзімір Мядзінскі, а таксама кіраўнік беларускай праваслаўнай царквы мітрапаліт Веніямін. Крыж устанавілі на брацкай магіле невядомых салдат Першай сусветнай ля храма Аляксандра Неўскага на Ваенных могілках у Мінску[171]. Гэта высокі абеліск з чорнага мармуру з крыжам на версе, рэльефным гербам Расійскай імперыі і надпісам: «Здесь покоятся воины Русской императорйской армии, павшие при защите Отечества в 1915 году. Упокой, Господи, их души»[172].

***

[169] https://t.me/Associationedu/1216
[170] https://reform.news/medinskij-priehal-v-minsk-vypleskivat-russkuju-kulturu-vovne
[171] https://news.zerkalo.io/economics/93931.html?tg=9
[172] https://nashaniva.com/363745

**Памочнік Пуціна Мядзінскі хоча паставіць у Беларусі помнік расійскаму фельдмаршалу Івану Паскевічу — душыцелю паўстання 1830-31 гадоў, а таксама савецкаму маршалу Канстанціну Ракасоўскаму.**

Гэтае пытанне ён абмеркаваў з кіраўніком адміністрацыі Лукашэнкі Дзмітрыем Крутым. «Абмеркавалі ўстаноўку ў Беларусі помнікаў К. К. Ракасоўскаму і І. Ф. Паскевічу, абсталяванне мемарыяльных месцаў у Маскве і Мінску ў гонар Герояў Савецкага Саюза — ураджэнцаў Беларускай зямлі, сінхранізацыю выкладання гісторыі ў школе і іншыя праекты па захаванні гістарычнай памяці», — напісаў Мядзінскі ў сваім тэлеграм канале[173].

***

**Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш ператварылася ў ідэалагічнае прапагандысцкае мерапрыемства.**

Асноўная тэма, на якую сёлета зрабілі акцэнт арганізатары, — «80-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне». Аднак калі ўважліва прааналізаваць усе пункты праграмы выставы-кірмашу, становіцца зразумелым, што «80-годдзе Перамогі савецкага народа» сталася шырмай, за якой хаваюцца зусім іншыя мерапрыемствы і ідэалагічныя канструкты. Першы канструкт тычыцца «агульнай гісторыі», у топку якой трапляюць даволі нечаканыя рэчы, і нашы падзеі і дзеячы насамрэч падаюцца праз рускі наратыў. Акрамя тэмы Другой сусветнай вайны, дэманструюцца «пераканальныя» факты ўсеагульнага адзінства, увасобленыя ў вялікай колькасці мерапрыемстваў і прэзентацыі кніг, якім на выставе надзяляецца асаблівая ўвага: «Наш Президент», «Уроки Донбасса», «Символы суверенной Беларуси», «Государственность Беларуси: даты, факты, события», «Институт Президентской власти — укрепление беларусской государственности», «Исходный код»… Трэці момант ідэйнай скіраванасці праграмы кніжнага кірмашу: імкненне паставіць знак роўнасці паміж героямі Другой сусветнай вайны і «СВО»[174].

***

**Адбылося падвядзенне вынікаў 64-га Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі» ў рамках XXXII Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу.**

Нацыянальная бібліятэка Беларусі была ўзнагароджана дыпломам I ступені ў намінацыі «Беларусь памятае» за навукова-папулярнае выданне «Газетныя радкі чытаючы сэрцам. 1944» і дыпломам I ступені ў намінацыі «Сіла ў праўдзе і адзінстве» за масава-палітычнае выданне «Данбас — Наваросія: беларускі погляд»[175].

***

[173] https://nashaniva.com/363765

[174] https://reform.news/uroki-donbassa-kevlarovyj-vek-institut-prezidentskoj-vlasti-i-kniga-pra-kosmas-shto-nasamrjech-prjezentujuc-na-minskaj-mizhnarodnaj-knizhnaj-vystave-kirmashy

[175] https://t.me/minkultrb/50227

**У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прайшоў маштабны форум «Памяць і інавацыі. Гісторыя Вялікай Перамогі ў сучасных мультымедыя», прысвечаны 80-годдзю Вялікай Перамогі.**

На пляцоўцы музея сабраліся вядучыя эксперты ў галіне мультымедыя і тэхналогій, прадстаўнікі ўстаноў культуры Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. *«Форум стаў магутнай платформай для ўмацавання культурных сувязей, абмену вопытам і натхнення новага пакалення на вывучэнне гістарычнай спадчыны праз інавацыйныя падыходы»*[176].

***

**У Доме Масквы ў Мінску прайшоў Нацыянальны фестываль патрыятычнай песні «Салдацкі канверт».**

Конкурс прымеркаваны да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Па выніках адбору камісія вызначыць, хто прадставіць Беларусь на міжнародным фінале, які пройдзе з 3 па 7 траўня ў Стаўрапалі[177].

***

**У БДУКіМ адбыліся паказы для старшакласнікаў ваенна-патрыятычнага праекта «Лінія памяці. Код вайны».**

«Лінія памяці. Код вайны», аўтарам якога з’яўляецца дацэнт кафедры харэаграфіі Вольга Наўроцкая, — гэта сінтэз танца, музыкі, паэзіі і акцёрскага майстэрства. У пастаноўцы задзейнічаны выкладчыкі і студэнты кафедры харэаграфіі БДУКіМ, а таксама ўдзельнікі дзіцячых аматарскіх калектываў. Усяго ў праекце бяруць удзел больш за 60 чалавек. *«Паказы праекта садзейнічаюць захаванню гістарычнай памяці і фарміраванню ў маладога пакалення пачуцця гонару за сваю краіну»*[178].

***

**У Магілёве адкрыўся Міжнародны маладзёжны тэатральны форум «М.@rt.кантакт» — амаль цалкам з расійскай праграмай і мінімальнай колькасцю беларускіх спектакляў.**

Падчас фестывалю, які будзе доўжыцца 8 дзён, пакажуць 23 спектаклі: дзевяць — з Беларусі (з Бабруйска, Брэста, Гомеля, Мінска і Магілёва) і 14 — з Расіі. Адзін тэатр прыехаў з Азербайджана. Сярод дзевяці беларускіх спектакляў частка пастаўлена расійскімі рэжысёрамі. Трансфармацыя форуму і ператварэнне яго ў расійскае рэгіянальнае мерапрыемства адбыліся пасля звальнення восенню 2020 года дырэктара тэатра Андрэя Новікава, які з 2006 года быў кіраўніком «М.@rt.контакт». Больш за паўтара дзесяцігоддзя форум заставаўся па сутнасці адзіным праектам па падтрымцы тэатральнай моладзі[179].

---

[176] https://t.me/warmuseumby/2291
[177] https://minsknews.by/naczionalnyj-festival-patrioticheskoj-pesni-soldatskij-konvert-prohodit-v-minske/
[178] https://t.me/bguki/27435
[179] https://reform.news/u-magiljove-adkry-sja-mizhnarodny-maladziozhny-tjeatralny-forum-m-rt-kantakt-amal-calkam-z-rasijskaj-pragramaj-i-minimalnaj-kolkascju-belaruskih-spektaklja

***

**Балетнае лета ў Беларусі адкрые Прыморская сцэна Марыінскага тэатра.**

Аб маючых адбыцца выступленнях гэтага калектыву расказаў губернатар Прыморскага краю Расіі Алег Кажамяка. Паводле яго слоў, шырокі спектр супрацоўніцтва Беларусі і Прымор'я дапоўніцца новым напрамкам — у сферы культуры. У чэрвені на працягу чатырох дзён запланаваны паказы спектакляў «Тысяча і адна ноч», «Карсар», у якіх будуць задзейнічаны 230 артыстаў балета з Расіі. У Прымор'е спадзяюцца, што восенню Вялікі тэатр оперы і балета з Беларусі прыедзе ў гэты рэгіён з выступамі ў адказ. *«Гэта тая новая прыгожая старонка, якая яшчэ раз умацуе нашы адносіны не толькі ў эканамічных, спартыўных, сацыяльных, але і ў культурных адносінах»,* — сказаў Алег Кажамяка[180].

***

**Пасля нападак праўладных актывістаў у Мінску закрылі выставу «Беларускі бестыярый».**

Тэмай экспазіцыі абурылася праўладная актывістка і мастачка Святлана Жыгімонт. «Цудоўныя выставы праходзяць у Палацы ў Вялікі пост», — напісала яна. Яе незадаволенасць падхапілі Вольга Бондарава і Аляксандр Плавінскі. Яны ўгледзелі ў тэматыцы беларускіх міфаў і казак сатанізм і неапаганства. «Засталося толькі асвяціць выставачную залу галерэі мастацтва і некаторых недамастакоў, апантаных д'яблам, святой вадой. Зараз на гэтым месцы рыхтуецца новая экспазіцыя карцін», — напісаў Плавінскі і апублікаваў фоты таго, як выстаўку здымаюць[181].

***

**Быў адменены купальскі фестываль у Дудутках «Свята сонца».**

Фестываль у Дудутках «Свята сонца» павінен быў прайсці ў чэрвені ў дзявяты раз. На сайце дзяржагенцтва БелТА быў зроблены матэрыял пра падзею, аднак па даносе прарасійскай актывісткі Бондаравай фестываль быў адменены. Бондараву абурыла паганская сімволіка фестывалю: *«Праз насаджэнне неапаганства, праз рамантызацыю акультызму ажыццяўляецца разбурэнне праваслаўя»,* — напісала яна ў сацсетках. А пазней з'явіўся допіс пра тое, што яна атрымала афіцыйны адказ, які пацвярджае, што фестываль адменены, пасведчанне на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства анулявана. Згаданы артыкул на сайце БелТА выдалены: яго прыраўнялі да «рэкламы паслуг эзатэрыкаў, шаманаў, варажбітак і іншага інфацыганства». Фестываль «Свята сонца» праводзіўся ў музейным комплексе «Дудуткі» з 2016 года[182,183].

[180] https://belta.by/society/view/baletnoe-leto-v-belarusi-otkroet-primorskaja-stsena-mariinskogo-teatra-701603-2025/
[181] https://nashaniva.com/363702
[182] https://reform.news/admeneny-kupalski-festyval-u-dudutkah-svjata-sonca
[183] https://www.svaboda.org/a/33353765.html

**У год 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў Беларусі плануецца рэалізаваць больш за 150 мерапрыемстваў, з’явіцца купюра наміналам 80 беларускіх рублёў, Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны запусціў дзіцячы конкурс вакальнай творчасці «Сэрца спявае — Перамога жыве», Мінлясгас складзе дрэвамі ідэалагічны надпіс, які будзе відаць з самалётаў, а Мінскі абласны драматычны тэатр падрыхтаваў прэм’еру «Сем трафеяў радавога Шапкіна», на Магілёўшчыне рыхтуюць экскурсійны тур «Царскімі шляхамі» па месцах, якія наведвалі расійскія імператары, пасля ўмяшання Бондаравай у Дудутках скасавалі фэст на Купалле, імёны мастакоў на фестывалі «Арт-Мінск» зноў прапусцілі скрозь «сіта» цэнзуры, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі лічыць, што будынкі XIX стагоддзя не адпавядаюць сучасным патрабаванням, таму дзяржаве трэба іх зносіць, тым часам у Заслаўі ўжо знеслі да Дажынак карчму і краму, якія раней лічыліся помнікамі архітэктуры, кнігу «Выпадковы прэзыдэнт», старонкі «Арт-Сядзібы» і Славы Камісаранкі прызналі «экстрэмісцкімі», сярод забароненых да распаўсюду кніг — Мітчэл, Бакман і Муракамі, для бібліятэкі імя Караткевіча ў Рагачове закупляюць тысячы кніг, але ніводнай на беларускай мове, у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа (г. Віцебск) адбыўся прэм’ерны паказ спектакля «ДАМЫ і ГУСАРЫ» ў пастаноўцы, сцэнаграфіі і музычным афармленні заслужанага дзеяча мастацтваў Расійскай Федэрацыі, Вольга Няфёдава прызнала, што Купалаўскі тэатр дагэтуль не змог аднавіцца, а на яго сцэне Пермскі тэатр «Ля Моста» прадставіў спектакль «Звер» — навіны культуры за перыяд 21-31 сакавіка 2025 года.**

## Навінная павестка Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

За перыяд 21-31 сакавіка 2025 года на афіцыйным сайце[184] Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь былі апублікаваны 5 навін, якія былі прысвечаны:

- рабочай паездцы Міністра культуры Рэспублікі Беларусь Руслана Чарнецкага ў горад Слаўгарад (Магілёўская вобласць)[185];

- удзелу дэлегацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь на чале з Міністрам культуры Русланам Чарнецкім ва ўскладанні кветак у Дзень памяці Хатыні[186];

- сустрэчы ў Міністэрстве культуры з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Швейцарскай Канфедэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Крысцінай Хонегер-Залатухін[187];

[184] https://www.kultura.by/

[185] https://www.kultura.by/news/21-marta-sostoyalas-rabochaya-poezdka-ministra-kultury-zasluzhennogo-artist-respubliki-belarus-rusla/
[186] https://www.kultura.by/news/22-marta-delegatsiya-ministerstva-kultury-respubliki-belarus-vo-glave-s-ministrom-kultury-zasluzhenn/
[187] https://www.kultura.by/news/28-marta-v-ministerstve-kultury-sostoyalas-vstrecha-s-chrezvychaynym-i-polnomochnym-poslom-shveytsar/

- Калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы[188];

- зацвярджэнню лагатыпа 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне[189].

Афіцыйны тэлеграм-канал[190] Міністэрства культуры за названы перыяд апублікаваў 80 навін. Калі звярнуць увагу на мову паведамленняў, змешчаных у тэлеграм-канале, то асноўнай мовай па-ранейшаму застаецца руская.

| **Мова паведамленняў** | **колькасць навін** |
|---|---|
| Руская | 68 |
| Беларуская | 12 |
| Абедзве | 0 |

**Тэматычны змест паведамленняў:**

• нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры — 10 навін;

• тэма Вялікай Айчыннай вайны — 10 навін;

• міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы культуры — 16 навін.

**Нарады, заявы і працоўныя паездкі супрацоўнікаў Міністэрства культуры:**

***Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Руслан Чарнецкі:***

- правёў Адзіны дзень інфармавання на тэму «Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь — прававы фундамент адзінства і росквіту беларускага народа» ў горадзе Слаўгарад (Магілёўская вобласць)[191]. У рамках рабочай паездкі ў Слаўгарад правёў прамую тэлефонную лінію і прыём грамадзян[192].

- разам з прадстаўнікамі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у мемарыяльным комплексе «Хатынь» усклаў кветкі ў Дзень памяці Хатыні[193].

- выказаўся ў сувязі з інаўгурацыяй Аляксандра Лукашэнкі: *«Мы з вамі цудоўна бачым, якую падтрымку атрымлівае наша культура, як яна развіваецца ўсе гэтыя 30 гадоў. Колькі ў нас аднаўлена музеяў! Колькі пастаўлена цудоўных спектакляў, напісана выдатных песень. І кіно здымалася. Падтрымка ёсць»*[194].

[188] https://www.kultura.by/news/v-natsionalnom-akademicheskom-teatre-imeni-yanki-kupaly-proshla-kollegiya-ministerstva-kultury-respu/
[189] https://www.kultura.by/news/utverzhden-logotip-80-letiya-pobedy-sovetskogo-naroda-v-velikoy-otechestvennoy-voyne/
[190] https://t.me/MinobrofBelarus

[191] https://t.me/minkultrb/50349
[192] https://t.me/minkultrb/50342
[193] https://t.me/minkultrb/50400
[194] https://t.me/minkultrb/50463

***Начальніка аддзела па кінематаграфіі Міністэрства культуры Ірыны Дрыга:***

- выступіла з прывітальным словам у сталічным кінатэатры «Беларусь» на адкрыцці Дзён індыйскага кіно[195].

***Начальнік юрыдычнага аддзела Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Аксана Краж:***

- правяла «прамую тэлефонную лінію» па юрыдычных пытаннях у сферы культуры[196].

**Тэме Вялікай Айчыннай вайны былі прысвечаны такія навіны:**

- у Дзяржынскім раённым Цэнтры культуры і народнай творчасці працягнулася правядзенне акцыі «Разам з мастацтвам» — «Слава Пераможцам!». Мэта акцыі — падкрэсліць уклад беларускага народа і дзеячаў культуры ў Вялікую Перамогу, *«аддаць даніну памяці Героям, якія змагаліся дзеля працвітання нашай краіны»*[197].

- у Магілёве ў кінатэатрах «Радзіма», «Чырвоная Зорка», «Космас» прайшлі тэматычныя мерапрыемствы з праглядам беларускіх дакументальных фільмаў: «Хатынь. Засакрэчаная трагедыя», «Пераразвон», «Маленькая гераіня вялікай вайны», мастацкага фільма «Ідзі і глядзі»[198].

- у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў рамках правядзення цыкла круглых сталоў «Вехі Вялікай Айчыннай вайны» адбылося першае мерапрыемства цыкла: «Вехі Вялікай Айчыннай вайны. Трагедыя і подзвіг 1941 года». З прывітальным словам да прысутных звярнуліся генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін, кіраўнік прадстаўніцтва Расcупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь Юрый Макушын, а таксама дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Аляксандр Шпакоўскі[199].

- у Нацыянальным прэс-цэнтры Рэспублікі Беларусь абмеркавалі «Пытанні патрыятычнага выхавання і захавання гістарычнай памяці. Праекты Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у год 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне». Спікеры — кансультант упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Надзея Аўдзей, загадчыца культурна-адукацыйнага аддзела Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Кацярына Катлоўская, дырэктар Маладзёжнага тэатра эстрады Сяргей Мядзведзеў[200].

- Міністэрства культуры Беларусі зацвердзіла лагатып 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне[201].

[195] https://t.me/minkultrb/50496
[196] https://t.me/minkultrb/50355
[197] https://t.me/minkultrb/50370
[198] https://t.me/minkultrb/50383
[199] https://t.me/minkultrb/50412
[200] https://t.me/minkultrb/50505
[201] https://t.me/minkultrb/50641

**Тэме міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры** былі прысвечаны 16 навін, якія закранулі кантакты з наступнымі краінамі:

Расія — 12 навін;

Азербайджан — 2 навіна;

Індыя — 1 навіна;

Швейцарыя — 1 навіна.

***Расія:***

- у Нацыянальным гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Нясвіж» пачаў работу выставачны праект «Аб’екты сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ў Рэспубліцы Татарстан». Праект прымеркаваны да 20-годдзя ўключэння Нясвіжскага замка і 25-годдзя ўключэння Казанскага Крамля ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, а таксама да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі. Праект арганізаваны ў рамках супрацоўніцтва паміж музеямі-запаведнікамі «Нясвіж» і «Казанскі Крэмль»[202].

- у Мінску быў прадоўжаны сумесны праект Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага Рускага музея «Расія — Беларусь. Скрыжаванне лёсаў»[203].

- стала вядома, што з 1 па 4 красавіка адбудуцца канцэрты ў рамках праекту «Харавы саюз: Расія — Беларусь». У праграме выступы калектыву СТУДЭНЦКІ ХОР Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і ансамбля сучаснай харавой музыкі ALTRO CORO Расійскай акадэміі музыкі імя Гнесіных[204].

- у Екацярынбургу прайшлі «Дні Мінска»[205].

- стала вядома, што 2 красавіка, у Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі, у Бранскім абласным мастацкім музейна-выставачным цэнтры адбудзецца адкрыццё выставы «Славянская повада — душе отрада!» — сумесны выставачны праект Магілёўскага абласнога цэнтра народнай творчасці, Бранскага абласнога метадычнага цэнтра «Народная творчасць» і Бранскага абласнога мастацкага музейна-выставачнага цэнтра. Праект рэалізуецца ў рамках пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Магілёўскай вобласцю (Беларусь) і Бранскай вобласцю (Расія). Гэта першы міжнародны выставачны праект, які прадставіць сапраўдныя экспанаты, рэканструкцыі і фотаработы традыцыйных народных строяў Магілёўскай і Бранскай абласцей[206].

***Азербайджан:***

- у Культурным цэнтры «Фестывальны» Гродзенскага гарадскога цэнтра культуры адкрылася экспазіцыя, прысвечаная традыцыям Азербайджана. Выстава «Культурная спадчына Азербайджана» арганізавана сумесна з Гродзенскім абласным аддзяленнем міжнароднага грамадскага аб’яднання «Кангрэс азербайджанскіх абшчын» і праводзіцца з мэтай знаёмства з традыцыямі і культурай азербайджанскага народа і ўмацавання

[202] https://t.me/minkultrb/50491
[203] https://t.me/minkultrb/50597
[204] https://t.me/minkultrb/50614
[205] https://t.me/minkultrb/50616
[206] https://t.me/minkultrb/50627

міжкультурных сувязей. На выставе прадстаўлены прадметы побыту, касцюмы і дываны, якія дэманструюць азербайджанскія звычаі[207].

***Індыя:***

- у сталічным кінатэатры «Беларусь» адкрыліся Дні індыйскага кіно. Мерапрыемства пачалося з прывітальных прамоў Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Індыя ў Рэспубліцы Беларусь Ашока Кумара і начальніка аддзела па кінематаграфіі Міністэрства культуры Ірыны Дрыгі[208].

***Швейцарыя:***

- у Міністэрстве культуры адбылася сустрэча з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Швейцарскай Канфедэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Крысцінай Хонегер-Залатухін. На сустрэчы былі абмеркаваны пытанні ўдзелу швейцарскіх кінематаграфістаў у XXXI Мінскім міжнародным кінафестывалі «Лістапад» і правядзення ў Беларусі паказаў швейцарскіх фільмаў — пераможцаў і прызёраў міжнародных кінафестываляў[209].

## Дзейнасць расійскіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі

Расійскія арганізацыі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі (Рускі Дом у Гомелі, Рускі Дом у Мінску, Рускі Дом у Брэсце, Рускі Дом у Гродне), няспынна займаюцца прапагандай у гістарычнай сферы, усхваляюць савецкія каштоўнасці, спрыяюць інтэграцыйным працэсам Беларусі і Расіі, паслядоўна ўкараняюць у Беларусі расійскую культуру і рускую мову, перадаюць установам адукацыі і культуры камплекты кніг.

У перыяд з 21 па 31 сакавіка 2025 года расійскія арганізацыі былі ініцыятарамі ці (і) ўдзельнікамі такіх мерапрыемстваў і праектаў у Беларусі:

**- адкрыццё Еўразійскай канікулярнай школы «Гістарычная праўда» для настаўнікаў гісторыі** *(Музей Перамогі, Масква).* У адкрыцці прынялі ўдзел міністр асветы РФ Сяргей Краўцоў, першы намеснік старшыні Камітэта Дзярждумы па асвеце, старшыня Савета АНА «Еўразія» Алена Аршынава, член апякунскага Савета АНА «Еўразія», мецэнат Ілан Шор, а таксама педагогі. Праект Еўразійскай канікулярнай школы «Гістарычная праўда» для настаўнікаў гісторыі накіраваны на «ўмацаванне міжнароднага супрацоўніцтва настаўнікаў гісторыі». Мерапрыемства аб’яднала 150 педагогаў з розных краін, у тым ліку з Беларусі[210].

**- сустрэча гістарычнага клуба** *(Рускі Дом у Гомелі).* Сустрэча была прысвечана Дню яднання народаў Беларусі і Расіі. Кіраўнік Рускага Дома ў Гомелі Аляксандр Маржухін адзначыў, як важна «захоўваць і ўмацоўваць тое, што ўжо дасягнута ў рамках брацкіх адносін паміж нашымі краінамі»[211].

---

[207] https://t.me/minkultrb/50540
[208] https://t.me/minkultrb/50496
[209] https://t.me/minkultrb/50553
[210] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16757
[211] https://t.me/russiangomel/6615

**- акцыя «Георгіеўская стужка»** *(Рускі Дом у Гомелі).* Рускі Дом у Гомелі далучыўся да акцыі, прымеркаванай да Дня Вялікай Перамогі, па распаўсюджванні георгіеўскіх стужак і прапанаваў распаўсюджваць стужкі сярод калег і сяброў. «Георгіеўская стужка — гэта не проста сімвал, гэта знак нашай памяці і падзякі героям, якія выратавалі свет ад фашызму»[212].

**- фінальны гала-канцэрт III Міжнароднага музычнага фестывалю «Свае»** *(культурны духоўна-асветніцкі цэнтр «Каўчэг»).* Выступілі творчыя калектывы Беларусі і Расійскай Федэрацыі з Краснадара, Масквы, Краснаярска і так званых ЛНР, ДНР. Фестываль прайшоў пры падтрымцы прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь і Фонду Аляксея Талая[213].

**- «Вечар рускай культуры», прымеркаваны да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі** *(Гомель).* Свята пачалося з забаўляльнай праграмы «Рускія вячоркі», працягнулася канцэртнай праграмай «Руская душа», у якой прынялі ўдзел госці з Расіі. З прывітальным словам звярнуўся кіраўнік Рускага Дома ў Гомелі Аляксандр Маржухін, падкрэсліўшы важнасць культурнага адзінства і сяброўства паміж нашымі народамі. «Гэты вечар зноў даказаў: нягледзячы на межы, Беларусь і Расія — адна душа, адна гісторыя і адна вялікая сям’я»[214].

**- конкурс чытальнікаў «Гучныя чытанні “Вася Цёркін — наш герой!”»** *(Гомельская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна).* Конкурс прысвечаны твору Аляксандра Твардоўскага «Васіль Цёркін. Кніга пра байца». У конкурсе прынялі ўдзел школьнікі Гомеля. Рускі Дом у Гомелі выступіў сузаснавальнікам конкурсу і падрыхтаваў памятныя падарункі для пераможцаў і прызёраў[215].

**- інтэлектуальная гульня па творчасці Івана Крылова на прызы Рускага Дома ў Мінску** *(бібліятэка № 9 імя Янкі Купалы, г. Магілёў).* У мерапрыемстве прынялі ўдзел старшакласнікі Магілёўскай гарадской гімназіі № 1. Удзельнікі павінны былі інсцэніраваць байкі Івана Крылова і прадэманстраваць навыкі чытання тэксту па ролях[216].

**- літаратурная гасцёўня, прысвечаная творчасці А. П. Чэхава** *(Рускі Дом у Брэсце).* Юныя артысты з тэатральнай студыі «Агні Мельпамены» ДУА СШ № 25 г. Брэста падрыхтавалі тэатралізаваны паказ па творах Чэхава[217].

**- сустрэча з аўтарамі літаратурна-мастацкага часопіса «Метамарфозы»** *(Рускі Дом у Гомелі)*[218].

**- выстава, прысвечаная творчасці Валянціна Сярова** *(Рускі Дом у Гомелі)*[219].

**- паказ мастацкага фільма «Пазыўны “Пасажыр”»** *(Рускі Дом у Мінску[220], Рускі Дом у Гродна[221], Рускі Дом у Брэсце[222]).*

---

[212] https://t.me/russiangomel/6622
[213] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16703
[214] https://t.me/russiangomel/6722
[215] https://t.me/russiangomel/6623
[216] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16689
[217] https://t.me/rcnkbrest/26176
[218] https://t.me/russiangomel/6595
[219] https://t.me/russiangomel/6643
[220] https://t.me/naukaiculturaRossiivBelarusi/16730
[221] https://t.me/russkiydomvgrodno/3611
[222] https://t.me/rcnkbrest/26161

**- паказ дзіцячых мультфільмаў расійскай вытворчасці** *(кінаклуб «Афіша» ў Рускім Доме ў Гомелі).* Гледачамі былі вучні пачатковых класаў з сярэдніх школ № 8 і № 44 імя М. А. Лебедзева[223].

**- паказ фільмаў, прымеркаваных да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі** *(кінаклуб «Афіша» ў Рускім Доме ў Гомелі)*[224].

## Агляд асноўных падзей, якія адбываліся ў Беларусі ў сферы культуры і гістарыяграфіі цягам 21-31 сакавіка 2025 года і маюць дачыненне да фармавання нацыянальнай ідэнтычнасці

Пры адборы галоўных тэм гэтага перыяду разглядаліся навіны культуры, апублікаваныя не толькі на рэсурсах профільнага Міністэрства, але і ў СМІ, тэлеграм-каналах іншых органаў кіравання культуры.

**Сярод навіннай павесткі можна вылучыць наступныя асноўныя падзеі:**

***

**У год 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў Беларусі плануецца рэалізаваць больш за 150 мерапрыемстваў.**

Пра гэта на прэс-канферэнцыі «Пытанні патрыятычнага выхавання і захавання гістарычнай памяці. Праекты Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у год 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне» расказала кансультант упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Надзея Аўдзей. Сярод мерапрыемстваў: мерапрыемства Саюзнай дзяржавы «Святочны канцэрт», агульнарэспубліканская акцыя «Беларусь памятае», канферэнцыі і семінары ў рамках навуковай супольнасці, наведванне знакавых месцаў і многае іншае[225,226].

***

**У Беларусі да 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне з’явіцца купюра наміналам 80 беларускіх рублёў.**

На 80-рублёвай купюры намаляваны галоўны манумент мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» — «Мужнасць»[227].

***

[223] https://t.me/russiangomel/6635
[224] https://t.me/russiangomel/6686
[225] https://t.me/belpresscenter/3369
[226] https://belta.by/society/view/vystavki-lektsii-konferentsii-minkultury-zaplanirovalo-bolee-150-meroprijatij-k-80-letiju-pobedy-705240-2025/
[227] https://t.me/minkultrb/50490

**Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны запусціў дзіцячы конкурс вакальнай творчасці «Сэрца спявае — Перамога жыве», прымеркаваны да 80-годдзя Вялікай Перамогі.**

На конкурс прымаюцца музычныя творы вайсковай тэматыкі[228].

***

**Мінлясгас складзе дрэвамі ідэалагічны надпіс, які будзе відаць з самалётаў.**

Міністэрства лясной гаспадаркі Беларусі анансавала ідэю да 80-годдзя перамогі над Германіяй у 1945 годзе — высадзіць вялізны надпіс «9 Мая» з жывых дрэў, піша БелТА. Гэтую дату «ўвекавечаць сіламі работнікаў» на полі ў Кіраўскім раёне[229].

***

**На Магілёўшчыне рыхтуюць экскурсійны тур «Царскімі шляхамі» па месцах, якія наведвалі расійскія імператары.**

Агенцтва «Магілёўаблтурыст» спадзяецца прыцягнуць больш расійскіх турыстаў. Плануецца аб'яднаць у адным туры месцы, якія наведвалі расійскія манархі Пётр I, Кацярына II і Мікалай II[230].

***

**Пасля ўмяшання Бондаравай у Дудутках скасавалі фэст на Купалле.**

У Дудутках скасавалі фестываль «Свята Сонца», прысвечаны Купаллю, які праводзілі з 2016 году. Аб адмене і фестывалю паведаміла ў сваім тэлеграм-канале прарасійская актывістка Вольга Бондарава. Сёлета на фэсце мелі выступіць Іван Кірчук, гурт KaS, іншыя музыкі[231].

***

**Імёны мастакоў на фестывалі «Арт-Мінск» зноў прапусцілі скрозь «сіта» цэнзуры.**

28 сакавіка ў Мінску адкрыўся адзін з найбуйнейшых фестываляў мастацтва ў Беларусі — «Арт-Мінск-2025». Сёлета арганізатары заявілі аб рэкорднай колькасці дасланых заявак на падзею — 1300. Але ў экспазіцыю ў Палац мастацтва трапілі 550 твораў ад 225 мастакоў «з усёй краіны». Па сутнасці, сёлета арт-фестываль паменеў на 25 аўтараў, чым у мінулым годзе, і больш чым на 200 у параўнанні з 2020 годам. Нагадаем, што сёння арганізатары выстаў як дзяржаўных, так і прыватных пляцовак мусяць дасылаць у Міністэрства культуры ці іншыя курыруючыя органы не толькі спісы ўдзельнікаў культурніцкіх падзей, але творы, якія будуць паказвацца на імпрэзе. Зверка імёнаў з «чорнымі спісамі» стала

---

228 https://t.me/warmuseumby/2304
229 https://belta.by/regions/view/minleshoz-sdelaet-iz-sazhentsev-zhivuju-nadpis-9-maja-v-kirovskom-rajone-705511-2025/
230 https://nashaniva.com/364506
231 https://www.svaboda.org/a/33353765.html

звыклай працэдурай, але даходзіць да таго, што і «добранадзейнага» аўтара могуць папрасіць памяняць твор, калі карціна падалася не надта «празрыстай» па пасыле[232].

***

**Міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі лічыць, што будынкі XIX стагоддзя не адпавядаюць сучасным патрабаванням, таму дзяржаве трэба іх зносіць і будаваць на іх месцы новыя.**

Пра тое, якое жыллё не мае сэнсу рамантаваць капітальна, Генадзь Трубіла распавёў у эфіры «Першага інфармацыйнага». «У Бабруйску яшчэ стаяць дамы 1876 года. Мэтазгоднасць іх капітальнага рамонту, на маю думку, цалкам адсутнічае, бо выдаткі на рамонт перавышаюць кошт будаўніцтва новага жылля. Таму мы цяпер працуем над гэтым пытаннем і ў наступную пяцігодку ўсё ж такі прапануем механізм рэнавацыі жыллёвага фонду, каб такія дамы, якія ўжо не адпавядаюць патрабаванням камфортнага пражывання, зносіць і будаваць на іх месцы новыя», — заявіў міністр[233].

***

**У Заслаўі знеслі да Дажынак карчму і краму, якія раней лічыліся помнікамі архітэктуры.**

Гістарычныя будынкі пазбавілі статусу, калі рыхтаваліся да Дня беларускага пісьменства. Першы будынак — колішняя крама 1912-1914 гг. пабудовы па вуліцы Савецкай, 34 — быў знесены ў пачатку лютага, другі — колішняя карчма 1911-1914 гг. па Савецкай, 36 — 18 сакавіка. Між тым гэтыя два будынкі па Савецкай вуліцы яшчэ дзесяць гадоў таму афіцыйна лічыліся гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі[234].

***

**Кнігу «Выпадковы прэзыдэнт», старонкі «Арт-Сядзібы» і Славы Камісаранкі прызналі «экстрэмісцкімі».**

У выніку рашэння суду Ленінскага раёну Магілёву ад 20 сакавіка ў пералік уключылі афіцыйны сайт коміка Славы Камісаранкі, а таксама Instagram і YouTube-каналы артыста. Кніга «Выпадковы прэзідэнт» суаўтарства забітага Паўла Шарамета прызнана «экстрэмісцкай». Аўтары кнігі — журналісты Святлана Калінкіна і Павел Шарамет. У спісе цяпер і рэсурсы «Арт Сядзіба», у тым ліку старонкі праекту ў Soundcloud, Facebook, «Укантакце», YouTube. Суполка ў «Аднакласніках» «Сэрца беларуса — мова беларуса!» уключаная ў пералік ажно двойчы: на рашэнне суду Баранавіцкага раёну і Баранавічаў ад 20 сакавіка і на рашэнне суду Астравецкага раёну ад 20 сакавіка[235].

***

[232] https://reform.news/imjony-mastako-na-festyvali-art-minsk-zno-prapuscili-skroz-sita-cienzury
[233] https://nashaniva.com/364555
[234] https://nashaniva.com/364311
[235] https://www.svaboda.org/a/33358285.html

**У Беларусі абнавілі спіс забароненых да распаўсюду кніг — сярод іх Мітчэл, Бакман і Муракамі.**

Міністэрства інфармацыі дадала яшчэ 27 кніг у спіс забароненых да распаўсюду ў Беларусі друкаваных выданняў. Сярод іх кніга «Воблачны атлас» Дэвіда Мітчэла і раман «Дзеці з камеры захоўвання» Ру Муракамі[236].

***

**Для бібліятэкі імя Караткевіча ў Рагачове закупляюць тысячы кніг, але ніводнай на беларускай мове.**

Дзяржаўную закупку па набыццю кніг мастацкай літаратуры для Рагачоўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Уладзіміра Караткевіча ладзіць «Цэнтр па забеспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый Рагачоўскага раёна». За 7 тысяч рублёў плануецца закупіць 3 475 кніг, з якіх няма ніводнай на беларускай мове. Фонд бібліятэкі, названай у гонар класіка беларускай літаратуры, хочуць укамплектаваць сотнямі кніг (кожнай — па некалькі экзэмпляраў). Усе яны — для дзяцей. У асноўным гэта расійскія казкі — такія як «Колобок», «Царевна-Лягушка» — і зборнікі апавяданняў[237].

***

**У Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа (г. Віцебск) адбыўся прэм’ерны паказ спектакля «ДАМЫ і ГУСАРЫ» па п’есе драматурга Аляксандра Фрэдры ў пастаноўцы, сцэнаграфіі і музычным афармленні Аляксандра Бармака, заслужанага дзеяча мастацтваў Расійскай Федэрацыі[238].**

***

**Вольга Няфёдава прызнала, што Купалаўскі тэатр дагэтуль не змог аднавіцца.**

Актрыса, якая з 2021 года спалучае ігру на сцэне з пасадай мастацкай кіраўніцы тэатра імя Янкі Купалы, у інтэрв’ю «Мінск-Навінам» прызналася, што ёй няпроста і граць, і кіраваць тэатрам. Адна з прычын — дэфіцыт прафесіяналаў. Нагадаем, што ў жніўні 2020 года з вядучага беларускага тэатра на знак пратэсту супраць гвалту сілавікоў звольніліся амаль усе акцёры і супрацоўнікі[239].

***

**Пермскі тэатр «Ля Моста» прадставіў спектакль «Звер» на сцэне Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імёны Янкі Купалы[240].**

***

---

[236] https://t.me/viasna96/30317
[237] https://d3h22ms60ks0ut.cloudfront.net/by/naviny/nivodnaj-belaruskaj-knigi-dlja-biblijateki-imja-karatkevicha-w-ragachove-zakupljajuc-tysjachy-knig.html
[238] https://t.me/minkultrb/50461
[239] https://minsknews.by/dlya-menya-kupalovskij-eto-dusha-nashej-strany-olga-nefyodova-ob-energetike-teatra-otvetstvennosti-i-lyubvi/
[240] https://belta.by/culture/view/legendarnyj-spektakl-zver-predstavil-permskij-teatr-u-mosta-na-stsene-kupalovskogo-teatra-704675-2025/

**Да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне Мінскі абласны драматычны тэатр падрыхтаваў прэм’еру «Сем трафеяў радавога Шапкіна».**

Спектакль паказалі 27 сакавіка, у Міжнародны дзень тэатра[241].

***

***Выставы, на якія варта звярнуць увагу:***

**- «Масты сяброўства. Беларусь — Расія»** *(Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў Беларусі).* Выстава прымеркавана да Дня яднання народаў Беларусі і Расіі[242]. Работы, прадстаўленыя на выставе, створаны беларускімі і расійскімі мастакамі Асацыяцыі мастакоў-пленэрыстаў РФ падчас выязных пленэраў[243].

[241] https://t.me/kultinfa/11764
[242] https://minsknews.by/vystavka-mosty-druzhby-belarus-rossiya-otkroetsya-v-nczsi-26-marta/
[243] https://belta.by/culture/view/chelovek-truda-glazami-hudozhnika-vystavka-mosty-druzhby-belarus-rossija-otkrylas-v-ntssi-705122-2025/